Стратэгічныя прадпрыемствы Беларусі (а такіх амаль 100) прадавацца не будуць.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№ 45 (4400)

11 чэрвеня 2019 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!



АКТУАЛИИ

Светлана КАЛИНКИНА

Товарищ Путин, вы большой ученый

Президент России Владимир Путин на Петербургском экономическом форуме на вопрос о возможном объединении с Беларусью почесал глаз, поерзал ногой и выдал: «По моему глубокому убеждению, мы все-таки один народ. Но так сложилось, что мы живем в разных странах, разные государства образовались... Сегодня нет никаких оснований для государственного объединения, у нас нет таких планов, целей нет. У нас есть план строительства Союзного так называемого государства».

Присутствующие встретили заявление бурными аплодисментами. Отсутствующие, но следящие за новостями в Минске даже успокоились: Путин сказал «нет», пронесло.

Я бы успокаиваться не торопилась. Во-первых, Путин употребил слово «сегодня». Сегодня планов нет, а завтра?..

Во-вторых, когда экс-президент США Билл Клинтон, отрицая в суде свои отношения с Моникой Левински, все время трогал себя за нос, специалисты по всему миру расценили это как верный признак неискренности. Путин чешется и ерзает при ответе на вопрос о Беларуси – и это искренний ответ?..

Ладно, допустим.

Но зачем тогда он вновь и вновь вытаскивает в информационное поле миф про «один народ». «Я так считаю, я убежден», – настаивает президент России. Хотя миф про «единый народ» уже лет пятнадцать как опровергнут именно российскими учеными. Он что, после учебников в Высшей школе КГБ больше ничего не читал? Вокруг него никто ничего, кроме банковских счетов, не читает? Еще и аплодируют… Ватники!

Напомню то, что известно всем более-менее интересующимся темой про «один народ».

Монография «Русский генофонд», написанная под руководством известного российского генетика и антрополога, доктора биологических наук, профессора Елены Балановской, в свое время стала настоящим информационным взрывом. Это было первое подобное исследование, и оно оказалось сенсационным. Исследователи в пух и прах разгромили пресловутый миф о «восточных славянах» – о том, что якобы белорусы, украинцы и русские составляют группу «восточных славян». Выяснилось, что нет никакой группы и нет никаких восточных славян. Единственными славянами из этих трех народов ученые признали только нас, белорусов. Да и то не восточными, а западными. Генетически мы оказались далеки и от русских, и от украинцев, но зато очень-очень близки к полякам, а еще – чехам и словакам. Свою «близкую родню» русские исследователи нашли не у нас, а в Финляндии.

«Результаты исследований российских ученых о генофонде русского народа еще долго будут усваиваться в обществе, ибо они полностью опровергают все существующие у нас представления, сводя их к уровню ненаучных мифов. Эти новые знания надо не столько понять, сколько к ним надо привыкнуть. Теперь абсолютно ненаучной стала концепция о «восточных славянах», ненаучными являются съезды славян в Минске, где собираются вовсе не славяне из России, а русскоязычные финны из России, которые генетически славянами не являются и к славянам никакого отношения не имеют. Сам статус этих «съездов славян» полностью дискредитирован российскими учеными. Русский народ назван по результатам этих исследований учеными России не славянами, а финнами. Финнами названо и население Восточной Украины, а население Западной Украины генетически сарматы. То есть украинский народ – тоже не славяне», – писал в то время журнал «Власть».

Владимир Путин может не верить американским ученым, польским, белорусским, но своим-то должен верить. Но он, наплевав на науку, по какой-то причине настойчиво распространяет пропагандистские выдумки. И нам главное понимать – по какой.

Кто-то скажет, что гены – чушь, что «единый народ» – это про историческую общность. Но и тут получается пальцем в небо. Потому что к Российской империи белорусские земли были присоединены только в самом конце XVIII века. И, надо сказать, жестоко, кроваво присоединены. Много это или мало, чтобы говорить про «единый народ»?.. Видимо, мало. По крайней мере монголо-татарское иго на Руси длилось триста лет, но про то, что русские с монголами «один народ», в Кремле помалкивают. Чего тогда к нам прицепились?

Конечно, байки про «один народ» – это тот информационный фон, который не позволяет позорной истории про Союзное государство Беларуси и России наконец закончиться.

Для нас – позорной. Для России – лестной, конечно. Потому что кто еще попросился с ней в одно государство? Даже непризнанная Абхазия не захотела. А мы, белорусы, получили исторический шанс, дар, возможность реализовать мечту о собственном государстве, но зачем-то побежали в Москву какое-то союзное государство строить. Удивительная трусость и непростительная историческая ошибка!

Но ошибки надо признавать и исправлять. Есть союзы, есть союзники, но никакого Союзного государства быть не должно. Что бы ни говорил Путин, это либо перспектива объединения, вхождения Беларуси в состав России, либо абсурд.

И хватит уже нам чушь втюхивать, что без Союзного государства нельзя отменить межгосударственный роуминг, нельзя договориться о налогах и пенсиях, нельзя ездить, нельзя торговать, нельзя жить. Весь мир живет, и мы будем.

А про один народ... Для начала пусть они с наследниками Орды на эту тему поговорят.

СЕНСАЦИЯ!

Игорь Шуневич ушел в отставку

Вчера А.Лукашенко принял рапорт об отставке министра внутренних дел.



Таким Игорь Шуневич запомнился многим.

Игорь Шуневич сказал, что сам подал рапорт об отставке.

«Пройден очень длинный и сложный путь работы в министерстве. Многое сделано. В какой-то момент я начал понимать, что нужно обеспечивать преемственность, динамику, скорость и эффективность принятия решений. И это достаточно сложно – быть актуальным, – сказал он belta.by, объясняя причины такого шага. – *Во-первых, нужен свежий взгляд на работу министерства. Во-вторых, думая и о своей эффективности, считаю, что пришло время сменить род деятельности. Достаточно долго я нахожусь в должности министра. Может, глаз замылился. Может, нужно попробовать что-то другое. Это единственная мотивация, я ее изложил главе государства, он с этим согласился».*

Куда уходит Шуневич? Не в Совет ли безопасности вместо Станислава Зася?

Сам Шуневич говорит, что пока конкретных предложений ему не поступило.

«Жизнь продолжается. Желание и возможность работать есть. В сложившейся ситуации я не вижу абсолютно ничего экстраординарного. Все развивается по спирали. Сидеть сложа руки я точно не буду. Надеюсь быть полезным государству на любой должности».

Шуневич руководил МВД с мая 2012 года.

Вера ВИР.

ГАЗЕТА – ЧЫТАЧЫ

Калі хочаш лепшай долі – дапамажы «Народнай Волі»!

На пальцах адной рукі можна пералічыць усе незалежныя грамадска-палітычныя друкаваныя газеты, якія выходзяць у Беларусі. «Народная Воля» – у лідарах.

Для журналістаў «Народнай Волі» няма забароненых тэм, як і недатыкальных асоб. Свабода слова, плюралізм меркаванняў, змаганне за тое, каб Беларусь нарэшце стала сапраўднай дэмакратычнай краінай, – вось галоўныя прынцыпы рэдакцыйнага калектыву.

Вядома ж, сіла газеты – у згуртаванасці яе прыхільнікаў. Паколькі поўным ходам ідзе падпіска на другое паўгоддзе, то ва ўсіх, хто хоча дапамагчы «Народнай Волі», ёсць магчымасць зрабіць гэта, не выходзячы з дома. Заходзьце, калі ласка, на сайт Belpress.by і праводзьце аплату праз сістэму «Расчет» (АРІП).

Пры гэтым заўважым, тэрмін афармлення падпіскі праз інтэрнэт на ліпень–снежань 2019 года – да 20 чэрвеня.

Застаецца і традыцыйная форма падпіскі на «Народную Волю». Толькі майце на ўвазе: каб не застацца без любімай газеты з 1 ліпеня, вам неабходна зазірнуць у любое паштовае аддзяленне да 26 чэрвеня. Спецыялізаваныя пункты «Белсаюздруку» будуць прымаць плату за падпіску на ліпень да 23 чэрвеня. Кошт месячнага камплекту нумароў менш за 8 рублёў. Падпісныя індэксы: **63222** – для індывідуальных падпісчыкаў, **632222** – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Нагадваем: у бліжэйшыя месяцы Беларусь чакаюць вялікія падзеі. На старонках «Народнай Волі» яны знойдуць аператыўнае і аб’ектыўнае адлюстраванне. Таму звярніце ўвагу на наступныя радкі:

Калі хочаш лепшай долі – дапамажы «Народнай Волі».
У свеце ПРАЎДЫ жыць імкніся, на газету падпішыся!

Рэдакцыя.

СРАВНИМ...

На сколько литров бензина хватает средней зарплаты в странах-соседках?

«На среднюю заработную плату по Республике Беларусь в 2019 году можно приобрести около 644 литров бензина АИ-92, что почти в два раза больше, чем в соседней Украине», – сообщил на прошлой неделе концерн «Белнефтехим», объясняя белорусам, почему цены на бензин в нашей стране снизить не получается.

Мы решили сравнить, а сколько топлива на среднюю зарплату могут приобрести жители других соседних с нами стран, а также Казахстана – страны-участницы Таможенного союза. Для расчета взяли цену бензина с октановым числом 95, потому что АИ-92 в европейских странах нет. И цену на бензин тоже взяли среднюю, потому что она в разных регионах стран-соседок, в зависимости, например, от компании, которой принадлежит АЗС, может отличаться. Это только в Беларуси цены на бензин одинаковые по всей стране.

К слову, автовладельцу в России средней зарплаты хватит на 1100 литров АИ-92, то есть почти в 2 раза больше, чем белорусу.

Итак, что касается бензина АИ-95.

Страна	Средняя зарплата (в евро)	Цена за 1 л АИ-95 (в евро)	На сколько литров хватит зарплаты
Беларусь	449	0,71	632
Латвия	1064	1,27	837
Польша	1180	1,20	983
Литва	1262	1,22	1034
Казахстан	400	0,38	1052
Россия	635	0,60	1054

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ЧУЛІ?

Іван Падгурскі будзе выконваць абавязкі міністра ўнутраных спраў

З’явілася інфармацыя, што функцыі міністра ўнутраных спраў часова (а магчыма, і пастаянна) будзе выконваць генерал-маёр **Іван Падгурскі**. Яму 54 гады. Начальнік крымінальнай міліцыі. Родам з Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

СТАЛІЦА

Трэцяя лінія метро прыме пасажыраў 2 студзеня 2020 года

Усе работы вядуцца па графіку. У першыя дні кастрычніка будзе завершана праходка трасы. Станцыя «Вакзальная» стане першай наземнай. Самая глыбокая (больш за 25 метраў) – «Юбілейная плошча» (перакрыжаванне вуліц Мельнікайтэ, Кальварыйскай, Раманаўская Слабада і Сухой). Менавіта ў гэтым месцы пасажыры змогуць пераходзіць з трэцяй на другую лінію метро).

Вольга КАРАЛЬКОВА.

ІНІЦЫЯТЫВА

Літоўцы клапоцяцца пра беларусаў

Беларускіх і ўкраінскіх пенсіянераў, якія стала жывуць у Літве, прапануюць з наступнага года лячыць бясплатна, нават калі яны ніколі не плацілі падатак на абавязковае страхаванне здароўя.

Як паведамляе Delfi, іх здароўе могуць застрахаваць за дзяржаўны кошт, як гэта робяць з літоўскімі пенсіянерамі.

Цяпер у Літве жывуць каля дзвюх тысяч беларусаў і ўкраінцаў пенсіённага веку.

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА



Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук

Не лезть в пасть медведю

Прямо скажем, зловещая информация о переговорах на полях Международного экономического форума в Санкт-Петербурге по переходу Беларуси и России на единую валюту пришла на днях от главы Минэкономразвития РФ М.Орешкина. С ним за одним столом сидел наш министр экономики Д.Крутой.

Этот факт заставляет меня повториться о том, о чем я не единожды писал: ВВП Беларуси составляет 3% от ВВП России, какой резон восточному соседу вводить какую-то общую валюту? Ради чего огород городить? Всем понятно: ею, единой валютой, может быть только российский рубль. Об этом российский премьер Д.Медведев прямо намекнул в известном ультиматуме.

На наш выстраданный национальный атрибут не раз надвигалась реальная угроза. В сентябре 1993 года, после неожиданного введения Москвой российского рубля, шесть стран СНГ – Армения, Беларусь, Казахстан, Россия, Таджикистан, Узбекистан – договаривались о создании рублевой зоны нового типа. Не срослось. Тогда белорусский и российский премьеры В.Кебич и В.Черномырдин подписали Соглашение об объединении денежных систем государств и переходе на единое средство расчетов – российский рубль. Насколько я помню, В.Кебич заявлял, что переход Беларуси на более стабильный в то время российский рубль – его голубая мечта. Видимо он считал, что с заменой инфляционного и девальвационного белорусского рубля на более стабильную валюту России решатся многие проблемы в разваленной экономике Беларуси. Вероятно, тогда правительству и его главе было не до суверенитета. Но Россия не горела желанием брать на себя разбалансированную экономику Беларуси с большим бюджетным дефицитом. Я думаю, впоследствии, через несколько лет, московские бонзы об этом горько пожалели. А тогда, в мае 1994 года, председатель правления Национального банка Беларуси Станислав Богданкевич провел пресс-конференцию, на которой заявил, что подписанный в Москве договор об объединении денежных систем двух стран противоречит Конституции Беларуси и он не поставит на нем свою подпись, что сыграло решающую роль в вопросе сохранения национальной валюты.

Вторая волна угрозы существованию белорусского рубля как суверенной валюты накатилась в двухтысячных нулевых годах. Белорусский рубль окреп, стал менее инфляционен (в 2006 году – менее 7% годовых), приличней выглядела и экономика страны. Тогдашние главы центральных банков Беларуси и России (Прокопович и, кажется, Игнатьев) торжественно заявили, что все технические вопросы перехода на российский рубль с их стороны решены. Осталось только главам государств проявить политическую волю. Ее, слава Богу, и не последовало. Камнем преткновения стал вопрос о создании двух эмиссионных центров, который поставила белорусская сторона (в Москве и Минске), на что Россия, естественно, не согласилась: такого в финансовой природе нигде нет. На тот момент А.Лукашенко понял, что белорусский бюджет будет утверждаться в Москве, как он впоследствии говорил: будешь в Кремль за зарплатой ездить, наш Нацбанк превратится в филиал Банка России со всеми вытекающими последствиями.

Что из себя представляет сегодня российский рубль? Стратегически он полностью зависит от колебаний мировых цен на нефть. А там правят бал США и Саудовская Аравия. Поэтому от звания «деревянный», вышедшего из глубин российского народа, так и не избавился. Только-только белорусы избавились от опостылевших «баранок» на банкнотах – и что? Вот опять! Сравнения с региональной валютой евро тут некорректны. Эта действительно общерегиональная валюта. Страны-участницы зоны евро в основном строго выдерживают принятые денежно-финансовые параметры. В зоне один эмиссионный центр – Европейский центральный банк. Неслучайно ни Польша, ни Чехия, имея экономики не нам чета, не спешат вводить евро.

Тревожно, что все эти разговоры происходят на фоне «обострения» российско-белорусских отношений. Вопрос независимости Беларуси – наиважнейший и наиактуальнейший в предстоящих переговорах с Кремлем. Мне бы не хотелось, чтобы кто-то из белорусских переговорщиков, среди которых есть совсем молодые «государевы люди», захотел войти в историю с черной меткой. В историю сдачи государственного суверенитета. Национальная валюта – такой же атрибут государственного суверенитета, как флаг, герб и гимн. Особенно для Беларуси. И Д.Крутому нужно круто себя вести, а не лезть в пасть медведю.

БЛІЦ

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) прапануе правесці галасаванне падчас парламенцкіх выбараў у адзін дзень, уключыць прадстаўнікоў ад усіх палітычных партый у склад Цэнтральнай выбарчай камісіі, акруговых і ўчастковых выбарчых камісій, арганізаваць адкрыты і галосны падлік галасоў выбаршчыкаў.

Ваша меркаванне наконт таго, як павінны быць арганізаваны парламенцкія выбары?

Вольга СІДАРЭВІЧ, кіраўнік аддзела прыватнай будаўнічай фірмы:

– Празрыста і сумленна, каб не было да чаго прачапіцца. А якія партыі будуць у камісіях – мне ўсё роўна. Галоўнае – вынік.

Павел СЕВЯРЫНЕЦ, сустаршыня аргкамітэта па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя»:

– Каб арганізаваць парламенцкія выбары, патрэбны: а) рэальны парламент, б) свабодныя і сумленныя выбары, в) незалежная Цэнтральная выбарчая камісія. Ні таго, ні другога, ні трэцяга ў Беларусі дэ-факта няма і не будзе, пакуль пры ўладзе гэты рэжым.

А наконт таго, як павінны быць арганізаваны парламенцкія выбары, – ёсць міжнародныя стандарты, дакладныя рэкамендацыі АБСЕ. Адсутнасць палітычных рэпрэсій і палітвязняў, рэгістрацыя партый (напрыклад, БХД), аб'ектыўнае асвятленне ў СМІ, прадстаўнікі ўсіх удзельнікаў у камісіях, свабодная праца назіральнікаў, адсутнасць фальсіфікацый, адкрыты і галосны падлік з дэманстрацыяй бюлетэняў.

Дзмітрый КУЧУК, бізнесмен, генеральны дырэктар «Смеццесартавальнай ` станцыі «Заходняя»:

– Я згодны з тым, што кажуць сацыял-дэмакраты. Адзінае, што дадаў бы – палітычныя дэбаты. Без іх, на мой погляд, не можа абысціся ніводная палітычная кампанія. Трэба, каб палітыкі прэзентавалі свае праграмы, спрачаліся. Я лічу, што на беларускім тэлебачанні павінны даць эфір лідарам палітычных партый, прычым усіх без выключэння.

Ну, і самае важнае – арганізаваць бездакорны падлік галасоў.

Таццяна БЕРАЗНА, дызайнер:

– А хіба маё меркаванне можа на нешта паўплываць? Я ўвогуле не веру ў выбары ў нашай краіне.

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, грамадзянін і паэт:

– Гэтакіх прапаноў за апошнія 25 гадоў было ў Беларусі болей, чым у Кітаі кітайскіх папярэджанняў.

Ёсць Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, артыкул 65: *«Выбары з'яўляюцца свабоднымі. Падрыхтоўка і правядзенне выбараў праводзяцца адкрыта і галосна»*.

Ёсць выбарчае заканадаўства, якое на паперы не пярэчыць Канстытуцыі. Але ў рэальнасці – супярэчыць цалкам. Як у Беларусі, гэтак і ў Расіі, і ва ўсіх краінах з «вертыкаллю» – аўтарытарнай палітычнай сістэмай. І ніякія прапановы нічога не зменяць, пакуль мы не зменім сістэму.

Мы – гэта грамадства. Сама аўтарытарная сістэма да трансфармацый не прыстасавана. Хіба толькі да дэкаратыўных – як у Казахстане.

Юрась ГУБАРЭВІЧ, старшыня руху «За Свабоду»:

– Пашырыць правы назіральнікаў (бачыць кожны бюлетэнь у час падліку). Удзел у датэрміновым галасаванні толькі пры наяўнасці дакументальнага пацвярджэння. Фарміраванне камісій рандомнай выбаркай з усяго спісу прапанаваных.

Сяргей ЧЕРАЧЭНЬ, кіраўнік партыі «Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада»:

– У нашай краіне не важна, як галасуюць. Вынік залежыць ад таго, хто і як лічыць галасы. На мой погляд, на першым этапе паступальнага руху да дэмакратызацыі выбараў хопіць празрыстых скрыняў для галасавання і анлайн-назірання за падлікам галасоў.

Алег ГАЙДУКЕВІЧ, падпалкоўнік міліцыі ў адстаўцы, першы намеснік старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі:

– Парламенцкія выбары павінны прайсці ў строгай адпаведнасці з законам!

Мы з павагай ставімся да ўсіх прапаноў нашых калег па дэмакратызацыі выбарчага заканадаўства, многія з іх падтрымліваем. Але я перакананы, што трэба зрабіць галоўны крок: перайсці на выбары па прапарцыянальна-мажарытарнай сістэме. Па партыйных спісах павінна абірацца 50 працэнтаў дэпутатаў! Гэта значна зменіць выбары.

Зараз па аднамандатных акругах у кожнай акрузе адзін пераможца. А многія кандыдаты набіраюць 10–15–20 працэнтаў, за іх галасуюць людзі, але пры гэтым іх голас не прадстаўлены ў парламенце.

Партыйныя спісы гарантуюць альтэрнатыву ў парламенце і абласных Саветах. З'явяцца партыйныя фракцыі, вырасце роля парламента, грамадзянскай супольнасці. Усё гэта будзе садзейнічаць умацаванню суверэнітэту краіны і паляпшэнню жыцця людзей. Бо развіццё там, дзе больш канкурэнцыі.

Партыі абавязаны змагацца за ўладу і браць удзел у выбарах заўсёды. Не плакацца, што нешта немагчыма, а змагацца!

У верасні будзе з'езд ЛДПБ, на якім мы прадставім новую праграму, абноўленае кіраўніцтва, а таксама назавем імёны 110 кандыдатаў у дэпутаты. Мы вылучым свайго кандыдата ў кожную акругу краіны. Мы правядзём парламенцкую кампанію зусім па-новаму, прэзентуем новых асоб – маладых, мэтанакіраваных, паспяховых. Мы гатовы да выбараў.

Анатоль ШУМЧАНКА, кіраўнік РГА «Перспектыва»:

– Ёсць стандарты АБСЕ, якімі кіруецца ўвесь свет. Ёсць свежы прыклад Украіны, як трэба праводзіць выбары.

Выбары павінны быць выбарамі. Я для сябе не бачу сёння магчымасці ўдзелу ў парламенцкай кампаніі, таму што вынікі галасавання на ўчастку няма магчымасці праверыць людзьмі маёй каманды. Таму абмяркоўваць арганізацыю выбараў без заканадаўчых змяненняў у выбарчае заканадаўства – проста не бачу сэнсу.

Марына КОКТЫШ.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Які лёс напаткаў беларускіх «баевікоў»?

Амаль усе фігуранты «справы патрыётаў» засталіся на былых пасадах.

Нагадаем, што затрыманні па гэтай справе пачаліся пасля заявы беларускага кіраўніка 21 сакавіка 2017 года. Паведамлялася, што ў Беларусі «*затрымалі дзясяткі баевікоў*», якія «*трэніраваліся ў лагерах са зброяй*».

Цягам некалькіх дзён стала вядома пра дзясяткі затрыманых. Спачатку паведамлялася, што справа вядзецца аб «*падрыхтоўцы масавых беспарадкаў*», пазней з'явілася абвінавачанне ў «*стварэнні незаконнага ўзброенага фарміравання і ўдзеле ў ім*».



Па справе аб падрыхтоўцы масавых беспарадкаў праходзілі 35 чалавек. З іх 20 абвінавачваліся яшчэ і па артыкуле аб незаконным узброеным фарміраванні.

30 лістапада 2017 года старшыня Следчага камітэта **Іван Наскевіч** заявіў, што «*папярэдняе расследаванне па крымінальнай справе скончана, 27 лістапада прынята рашэнне аб спыненні крымінальнага пераследу ўсіх фігурантаў па справе і аб спыненні самога расследавання крымінальнай справы*».

Карэспандэнт «Народнай Волі» пагутарыў з некаторымі фігурантамі гэтай гучнай справы двухгадовай даўніны…



«Я зараз займаюся практычна тым жа, чым займаўся і да затрымання, – кажа **Андрэй Комлік-Ямацін.** – *Працую тэрмістам на Мінскім маторным заводзе, мяне ж ніхто не звальняў, нягледзячы на тое, што тры месяцы правёў у СІЗА. Больш за тое – практычна ўсе калегі падтрымлівалі ў складаны час, верылі ў мяне.*

Акрамя таго, мяне цягне да рамесніцтва – вырабляю вопратку і аксесуары ў этнастылі. Праўда, дома дзіця малое, таму часу вольнага зараз не так і шмат. Але распрацовак і задумак у мяне хапае».

Андрэй адзначае, што ў яго жыцці асабліва нічога не змянілася.

«Мяркую, што пра справу ўжо ўсе забыліся, – дадае суразмоўца. – *Хаця асабіста я такое не забуду, відаць, ніколі, бо ў ізалятары давялося правесці 100 дзён. І, як аказалася, тры месяцы сядзелі невінаватыя. Некаторыя хлопцы праз суд хацелі запатрабаваць ад дзяржавы кампенсацыю за нанесены маральны ўрон, але ім адмовілі і не заплацілі ні капейкі. Складана нешта даказаць у нашых судах».*

Міраслаў Лазоўскі апошнім з фігурантаў справы выйшаў на волю са следчага ізалятара. Крымінальная справа ў дачыненні да яго таксама была закрыта, хаця першапачаткова Лазоўскаму інкрымінавалася незаконнае захоўванне зброі: падчас затрымання ў сакавіку 2017-га ў багажніку яго машыны быццам бы знайшлі баявы аўтамат з патронамі. Але раптоўна высветлілася, што не было ні «баевікоў», ні «баявога аўтамата».

– Збольшага ў маім жыцці таксама нічога не змянілася, – кажа Міраслаў. – Працую па-ранейшаму ў «Кнігазборы». Адказваю за распаўсюджванне кніг, хаця даводзіцца рабіць і іншую працу. Трэба сказаць, што на кніжным рынку ёсць пэўная пакупальніцкая стагнацыя, таму працаваць не так проста. Ды і з боку беларускіх выдаўцоў прапановы пастаянна растуць, канкурэнцыя ўзмацняецца.

– Калі вы паставілі для сябе кропку ў крымінальнай справе, якую два гады таму распачалі, у тым ліку і ў дачыненні да вас?

– Калі справу афіцыйна закрылі, то, па сутнасці, гэта і стала той кропкай. Праўда, юрысты кажуць, што на працягу 10 гадоў яшчэ могуць быць пракурорскія праверкі па законнасці закрыцця справы, таму, як бачым, варыянты, магчымы. Былі ж прэцэдэнты, калі справу здавалі ў архіў, а праз гады зноў давалі ёй ход і накіроўвалі на дадатковую праверку.

Але, мне падаецца, паколькі справа палітычная, то варушыць яе наўрад ці хто будзе.

– Вы правялі ў следчым ізалятары 101 дзень. Нейкім чынам гэта адбілася на здароўі?

– Зрок крыху падсеў, бо ў камеры не было чаго рабіць, акрамя таго як чытаць, а лямпачка ледзь свяціла.

Горш іншае – некаторыя з тых, каго лічыў сябрамі, адвярнуліся пасля гэтай справы. А можа, гэта і да лепшага. Людзі такім чынам таксама прайшлі праверку, і, акрамя таго, з'явілася вельмі шмат новых сяброў.

– Як склаўся лёс іншых фігурантаў «справы патрыётаў»? Падтрымліваеце з імі кантакты?

– Наколькі вядома, большасць не змянілі месца працы. Аляксей Абрамаў працуе менеджарам па продажах, Андрэй Бяляўскі – мастак-дызайнер. Калі ў былога вайскоўца Уладзіміра Румянцава закончыўся кантракт, ён канчаткова пакінуў службу, хаця збіраўся гэта зрабіць раней. Паводле маёй інфармацыі, ён вучыўся на адмысловых курсах і зараз працуе ў IT-кампаніі. Былы супрацоўнік МНС Андрэй Дундукоў і кнігараспаўсюджвальнік Віктар Данілаў атрымалі спецыяльнасць «мантажнік-вышыннік» і ўладкаваліся на працу за мяжой, а Аляксандр Зімніцкі вучыцца ў Польшчы па спецыяльнасці «вайсковая гісторыя» і будзе там пісаць дысертацыю. Віктар Мароз – у бізнесе, Алесь Яўдаха будзе, напэўна, да скону дзён кнігі прадаваць… Адным словам, усе працуем, і тую крымінальную справу ўспамінаем толькі як жахлівы сон.

Алесь СІВЫ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Хто патрапіць пад амністыю?

Ёсць афіцыйная інфармацыя, што зараз праект закона аб амністыі ў сувязі з 75-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў праходзіць узгадненне ў дзяржорганах.

Амністыя можа закрануць 6,5 тысячы чалавек. Прадугледжваецца, што на волю выйдуць больш за 2 тысячы чалавек. Пад амністыю патрапяць бацькі-адзіночкі, якія выхоўваюць непаўнагадовых дзяцей, інваліды, ліквідатары наступстваў Чарнобыльскай аварыі, цяжарныя жанчыны, пэўная катэгорыя асоб, якія ўпершыню ўчынілі злачынствы. Разам з тым амністыя не закране карупцыйныя артыкулы, асабліва цяжкія злачынствы, у тым ліку забойствы.

КРЫМІНАЛ

Яшчэ адзін…

Следчы камітэт распачаў крымінальную справу ў дачыненні да намесніка дырэктара сталічнага КУП «Спецкамбінат КБА» **Сяргея Рудога**.

Паводле інфармацыі следства, у лютым мужчына прыняў хабар памерам не менш за 800 долараў за вырашэнне пытання, якое ўваходзіла ў яго кампетэнцыю.

Паводле ч.1 арт.430, Рудому пагражае да 5 гадоў пазбаўлення волі.

ИНИЦИАТИВА

«Робім разам»

30 метров «фронтовой» дороги в культурном городе

Когда в 2015 году Сергей Колотков переехал в дом по улице Сметанина, 18 в Витебске, друзья и знакомые ему завидовали. Новое, комфортное жилище, рядом тихий частный сектор, при этом недалеко центр города.

Впоследствии Сергей был избран председателем товарищества собственников и сразу же столкнулся с проблемами. Пару лет назад, для того, чтобы добиться ремонта фонарей во дворе, пришлось обратиться аж в Администрацию президента.

– Но главная наша проблема – 30 метров разбитой дороги на улице Рижской – не решена до сих пор, – говорит Сергей. – Жители нашего дома ежедневно ездят по этой дороге на работу и с работы. А нормального покрытия нет, ямы – чуть ли не до десяти сантиметров глубиной! После дождя – «лужищи». В мороз лужи подмерзают, ямы становятся незаметными, и авто проваливаются в них.

Любопытно, что, согласно документам застройщика, на дороге – гравийно-щебеночное покрытие, а согласно документам властей Витебска, она заасфальтирована. В общем, «дорога находится в удовлетворительном состоянии».

– Но на самом деле ямы никто не подсыпает, а асфальта положен лишь маленький кусочек четыре на полтора метра, – говорит Сергей.



В ненамного лучшем состоянии и улица Сметанина, ведущая в центр города. Асфальт на ней лежит, ехать можно, но полно ям, колдобин, а в одном месте, где находится люк, уже образовался небольшой провал.

Сергей вел переписку с властями города, о проблеме улицы Рижской снял репортаж телеканал ОНТ. Все безрезультатно. А ведь люди, честные налогоплательщики, явно достойны нормальной дороги.

И на помощь Сергею пришли члены общественного объединения «Говори правду» Дмитрий Дычек и Олег Квятинский. Они подсказали идею начать локальную кампанию «Робім разам», чтобы добиться асфальтирования участка улицы Рижской и ремонта улицы Сметанина.

Команда составила текст обращения и отправилась собирать подписи жителей дома №18. Почти все они поддержали инициативу.

Рассказывает Дмитрий Дычек:

– Разве нормально, что в культурном центре страны, городе «Славянского базара» и Марка Шагала, улица во «фронтовом» состоянии? Нас поддержали почти все жильцы дома №18 по улице Сметанина. В ближайшее время планируем собрать подписи и жителей близлежащих домов частного сектора. Обращение будет направлено в горисполком. В зависимости от того, какой получим ответ, будут и наши дальнейшие действия.

Команда «Робім разам» уверена, что асфальтирования улицы Рижской и ремонта улицы Сметанина в конце концов удастся добиться.

Андрей ИГНАТОВИЧ.

Более подробно об инициативе «Робім разам» можно узнать на сайте www.zapraudu.info.

ЛІСТЫ З ПАЛЕССЯ

4. На дне Герадотава мора

Як жывуць беларускія і ўкраінскія палешукі


Церабяжоўцы – Васіль Бруцкі, Іван Адамчук і Рыгор Гірса.


Аўтар і Наталка Пазняк над Гарынню.


Стараста Валянціна Мельнікава.

Бацька гісторыі Герадот паўтары тысячы гадоў таму пакінуў нам апісанне Прыпяцкай раўніны. Даследчыкі і сёння губляюцца ў здагадках: дзе ён пабачыў у нашых мясцінах мора, названае пазней Герадотавым? Мару палешукоў пра ўласнае мора зразумець можна. Але, хутчэй за ўсё, морам уявіўся гісторыку-вандроўніку пойменны разліў Прыпяці, які ў старажытныя часы, калі да меліярацыі Палесся яшчэ ніхто не дадумаўся, быў яшчэ больш велічны.

Тагачаснае бездарожжа не пакідала варыянтаў у выбары шляху. Самым надзейным быў водны, старажытнымі дарогамі былі рэкі. Думаецца, і Герадот плыў па Прыпяці. А калі плыў, то не мог не заўважыць, якое пакручастае рэчышча яна мае. Каб пераканацца ў гэтым, нам сёння дастаткова зірнуць на карту. Рака часам робіць такія павароты, што пачынае цячы ледзь не ў зваротным напрамку. Але потым нібы адумваецца і вяртае сабе стратэгічны кірунак, каб разам з Дняпром уліцца ў Чорнае мора.

У гэтым сэнсе Прыпяць – самая натуральная беларуская рака, бо ўся наша гісторыя – як прыпяцкае рэчышча: мы то наперад рухаемся, то на месцы патопчамся, то назад адступім. Але ўрэшце праз глыбокія віры і плыткія мелі мы ўсё ж працягваем рухацца па сваім нацыянальным азімуце.

Найбольш пакручастая Прыпяць акурат на Століншчыне. Паміж Мікашэвічамі і Давыд-Гарадком справа пад дых ёй б'е паўнаводная Гарынь, і Прыпяць паспешліва закладае левы віраж, каб прыйсці ў сябе. А можа, дзве ракі такім чынам проста гуляюць у свае рачныя гульні, дэманструючы ў выніку дружбу на векі вечныя? Хто ведае, вада, як даказалі навукоўцы, умее па-свойму думаць і па-рознаму рэагуе на розныя раздражняльнікі.

Несумненна адно – Гарынь плыве да нас з Украіны, плыве напорыста, і сваім узаемадзеяннем з Прыпяццю сведчыць пра свой заўважны ўплыў на беларускім баку. Але ж і Беларусь на сваю суседку неяк жа ўплывае. Каб даведацца пра гэтыя ўзаемаўплывы, я адправіўся на беларуска-ўкраінскае памежжа.

Вулічны парламент у Церабяжове

Крайняе паселішча з нашага боку – Верхні Церабяжоў – сустракае мяне традыцыйным вясковым спакоем. Ніхто тут не грувасціць на прысядзібных сотках парнікоў, як у Альшанах. Ніхто не месіць гліну, як у Гарадной, і не ідзе масава ў служкі Божыя, як у Рублі. Вёска перпендыкулярна ўперлася ў мяжу і нібы задумалася над сваім новым геаграфічным становішчам. На прыдарожных лаўках сядзяць ахвочыя да размоў пра ўсё на свеце вяскоўцы, прычым мужчыны і жанчыны асобна. Гэткі сабе двухпалатны Церабяжоўскі вулічны парламент.

Прысуседжваюся да трох церабяжоўцаў сталага веку, якія ці то жартам, ці то ўсур'ёз прапануюць наступны парадак дня: яны адказваюць на ўсе мае пытанні, але – за пляшку. Абяцаю паставіць дзве, калі пакажуць кантрабандныя сцежкі ва Украіну. Мужчыны адразу сумнеюць – відно, што нядаўна дэмаркаваная мяжа на надзейным замку і былой вольніцы няма.

«Тут непадалёку вёска Люты Бор, яе цяпер, відаць адсялілі, – прыгадвае **Васіль Бруцкі**. – Дык там адна хата стаяла на беларускай тэрыторыі, а прыбіральня – на ўкраінскай. Мне гаспадар сам расказваў, што па малой ці вялікай патрэбе хадзіў у суседнюю краіну... А сёння ні па якой патрэбе не сходзіш. Па нашым сенакосе нацягнуты калючы дрот, у бок Гарадной увесь лес перакапаны. Звер зачэпіць – адразу сігналізацыя спрацоўвае, памежнікі тут як тут. Ад нас рукой падаць – Мярлінскія балоты, там за Саветамі быў палігон. Колькі сюды ваеннай тэхнікі везлі – танкі, бэтээры! Суткамі кананада чулася. Там і цяпер снарады пазаставаліся, калі пажар, то выбухаюць. Калі торф загараецца, то цэлае лета патушыць немагчыма. Ён жа ўнутры гарыць, звонку не відаць. Раней з таго торфу брыкет рабілі, у Калодным завод быў. Яго даўно закрылі, а торф у кантэйнерах некуды вывозяць».

Паводле слоў маіх суразмоўцаў, шмат якія спажывецкія тавары яны набываюць ва Украіне. Там нашмат таннейшае рабочае адзенне, посуд, гума для аўто. А вось бензін у Беларусі танней, украінцы цугам едуць запраўляцца ў Столін. На церабяжоўскіх могілках стаяць украінскія надмагільныя помнікі, керамічная плітка ў хатах – таксама з-за мяжы. Больш танныя там бензапілы і пілы-балгаркі, але іх неабходна дэклараваць, і цягам некалькіх гадоў не маеш права ўвозіць падобны тавар.

Цікаўлюся, наколькі пільныя памежнікі па абодва бакі мяжы? «Трасуць – ажно гай шуміць, – прызнаецца Васіль Бруцкі, – і салон, і багажнік, і пад капот заглядаюць. Сабакі з усіх бакоў абнюхваюць. З нашага боку поўны парадак. А ўкраінцы часам чакаюць, што нешта дасі. Я тыдзень таму ехаў, там жанчына стаяла на пасту, дык адкрыта: дай што-небудзь. У мяне з сабой шакаладка была, то спатрэбілася».

«Без хлеба – дрэнь палітыка»

Церабяжоўскія вулічныя парламентары не цураюцца і палітычных тэм. Незалежную Беларусь яны ўспрымаюць як дадзенасць, хоць савецкае мінулае ўсе трое ўспамінаюць з непрыхаванай настальгіяй. «Навошта нам тая Еўропа, мы і без яе пражывём, – гарачыцца **Рыгор Гірса**. – Трэба з усімі дружыць – і з Расіяй, і з Украінай, хоць там парадку няма. Вось у СССР усе жылі дружна. Тут піражок 5 капеек каштаваў, і ва Уладзівастоку – 5, любата. А цяпер – там грыўні, там крамлёўскія рублі, тут беларускія, не разбярэшся.

З нашага Церабяжова былі трое братоў – усе ваенныя. Адзін у Афганістане служыў, другі ў Латвіі, трэці і цяпер недзе ў Расіі служыць. І вось той, што жыў у Латвіі, памёр. А яго жонка – з Гарадзішча (*першая вёска на ўкраінскай тэрыторыі*. – ***М.С.***), і там вырашыла мужа хаваць. То браты туды не паехалі, бо ў іх расійскія пашпарты. Правялі да граніцы і назад вярнуліся. Хіба гэта па-людску?» – ставіць пытанне рубам Рыгор Гірса.

Вядома ж, не па-людску. Але хіба па людску – весці гібрыдную вайну з тым, каго яшчэ ўчора называў братам? Хіба па-людску штодня паліваць суседа памыямі відавочнай хлусні з тэлеэкрана? Хіба па-людску глуміцца з тэрытарыяльнай цэласнасці суседняй краіны, прысвойваючы ўсё, што кепска ляжыць?

Але ў церабяжоўца **Івана Адамчука** на расійска-ўкраінскія адносіны свой погляд: «Я разоў дзесяць быў у Данбасе, там усе гавораць па-руску. Нашто ім перавучвацца? І Крым ва Украіны ніхто не забіраў, ён сам у Расію перайшоў праз гэты, як яго, рэферэндум. Каб не рускія, то сёння амерыканцы стаялі б у Крыме. І там было б тое ж, што на Данбасе. Новаму ўкраінскаму прэзідэнту Зяленскаму трэба мірыцца з Расіяй і вырашаць лёс Данбаса. У Данецку жывуць тры мае сястры, пакутуюць, бедныя».

Слухаў я церабяжоўцаў і прыгадваў радкі паэта Леаніда Галубовіча: «*Ды раптам скажа дзед які / з развагай аналітыка – / хлеб трэба сеяць, мужыкі, / без хлеба – дрэнь палітыка*». Мае суразмоўцы з такой жыццёвай мудрасцю пагадзіліся і дэбаты спынілі.

Дома і салома ядома

Тым часам я трапляю на пасяджэнне жаночай палаты вулічнага парламента, што праходзіла ў вішняку каля хаты старасты вёскі **Валянціны Мельнікавай**. Яна і распачала дыскусію, па які бок мяжы лепш людзям жывецца: «Нават зубы ва Украіне паставіць дзешавей! Мы для гэтага ва Удрыцк на цягніку ездзім. Там танней апрануцца, дзіця ў школу адзець. А нядаўна на граніцы зрабілі магазін бяспошліннага гандлю. У ім літр гарэлкі каштуе ўсяго 6 рублёў. У нас дазваляюць увозіць 3 літры, а ў іх толькі літр. То мы, прызнацца, трохі надурваем украінцаў, але як – я вам не скажу».

Нягледзячы на танную ўкраінскую стаматалогію і меншыя кошты на адзенне за блізкай мяжой, Валянціна Мельнікава, як і належыць нізавому звяну ўладнай вертыкалі, робіць прадказальную выснову адносна краіны шчасця. Што ж, як вядома, дома і салома ядома.

Задаволеная жыццём староста, праўда, агаворваецца, што пенсіі ў Беларусі малаватыя. За 375 рублёў штомесяц у яе ніяк не атрымліваецца з'ездзіць у адведкі да сына ў Новасібірск. А ў **Ніны Лугіной** пенсія яшчэ меншая, 286 рублёў, нягледзячы на 22 гады працы даяркай на ферме. «А я па 20 літраў вёдры валачыла, у мяне рукі аж да зямлі выцягнуліся», – абураецца цётка.

Пасяджэнні Церабяжоўскага парламента адбываюцца пры Савецкай вуліцы, па якой штохвілінна шмыгаюць у кірунку мяжы аўто. Уношу на разгляд пытанне наконт назвы вуліцы. Маўляў, у той жа Украіне ўсе савецкія назвы паскасоўвалі, дык, можа, і беларусам узяць прыклад з суседзяў? Але Валянціне Мельнікавай мая прапанова не падабаецца: «А чым кепска жыць на Савецкай? Не мы называлі, не нам і мяняць. Ва Украіне паперамяноўвалі, паскідалі Ленінаў. І чаго дамагліся? Хіба людзям там лепш ад гэтага стала? Украінцам натаўклі ў галовы, што Расія – агрэсар. А які яна агрэсар? Крым і Данецк самі ад Украіны адышлі».

Сваю старасту вырашае падтрымаць і **Люба Ворах**, якая дагэтуль удзелу ў дыскусіі не прымала: «От вы мяне паслухайце. От, напрыклад, вас ці мяне ўзялі за шкірку і пераваклі ў Расію. Гэта магчыма? Не. От таксама і з тым Крымам, я так разумею. Людзі ва ўсім свеце хочуць у спакоі жыць, без тузаніны, і наша Беларусь тут усім прыклад паказвае. А яшчэ наконт тавараў украінскіх хачу выказацца. От нядаўна я туфлі ў Дубровіцы купіла, 30 рублёў на нашы грошы аддала. Пяць дзён пахадзіла ў ФАП на ўколы і выкінула – падэшва разлезлася. Унуку стуль жа прывезла чаравікі – і яны праз два тыдні кашы папрасілі».

Прыгадаўшы палескую прыказку «як былі мы малы, то насілі пасталы, а як сталі мы вялікі, то купілі чаравікі», мы з церабяжоўкамі прыходзім да высновы, што беларускі абутак – найлепшы ў свеце. Хоць у адным мы аднадумцы.


Дом «бурштынавага барона» ў Дубровіцы.

Беларуская малочка і іконы з бурштыну

З Верхняга Церабяжова я еду ва Украіну – трэба ж даведацца, як там людзі жывуць. Мяжу праходжу неспадзявана хутка, за хвілін дваццаць, нават прызапашаная шакаладка не спатрэбілася. На ўкраінскім баку ў Гарадзішчы мяне чакае **Наталка Пазняк**, з якой мы папярэдне спісаліся ў «Фэйсбуку». Родам яна з Дубровіцы, а пад мяжу пад'ехала з недалёкага Пачаеўскага возера, дзе адпачывала з сям'ёй.

Наталка ў курсе ўсіх украінска-беларускіх спраў на памежжы: «Кожны чацвер у Дубровіцы кірмаш, дык у нас часта начуе, каб зранку гандляваць, жанчына з Пінска. Беларусы прывозяць пераважна малочку (ёгурты, сыркі, масла), трыкатаж, запчасткі, галантарэю. Нашы таксама часта ездзяць на закупы ў памежныя мястэчкі – Столін, Гарынь, Лунінец. Часцей пенсіянеры, бо для іх у нас праезд у дызелях бясплатны. Яшчэ адна прычына наведаць Беларусь – лекаванне, складаныя аперацыі ў вас больш танныя. А вось на працу ўкраінцы ездзяць больш у Польшчу».

Гадоў пяць таму Наталка падаравала мне ікону, зробленую з бурштыну. Ці здабываюць яго сёння на Дубровеншчыне? Аказваецца, пік бурштынавай ліхаманкі прыпаў на 2015–2016 гады, тады з рыдлёўкамі і помпамі ў лес хадзілі нават святары і школьныя настаўнікі. За ноч можна было спакойна зарабіць 100 долараў. Здабыча бурштыну лічыцца незаконнай, але паліцыя заплюшчвае на гэта вочы. У Дубровіцы легальна можна набыць вырабы з бурштыну – завушніцы, каралі, карціны. Добрым попытам карыстаюцца бурштынавыя партрэты, зробленыя пад заказ. Сёй-той на гэтым нядрэнна нажываецца, у райцэнтры можна пабачыць раскошныя палацы «бурштынавых баронаў». І дзеці ў школе мараць не пра ВНУ, а каб трапіць у «бурштынавы Кландайк» і за дзень зарабляць столькі, колькі большасць украінцаў мае за месяц.

«Каб у Кіеве перасталі красці, а на Данбасе страляць»

Разам з Наталкай мы ідзём па Гарадзішчы, якое мала чым адрозніваецца ад Верхняга Церабяжова (праўда, дарога адразу за памежным шлагбаўмам – як пасля бамбёжкі). Знаёмімся з пажылой гарадзішчанкай **Марыяй Піліпчук**, якая здымае ў гародзе першы ўраджай клубніц. Былая настаўніца, яна мае пенсію ўсяго 1800 грыўняў (каля 70 долараў). Заробкі ў яе калег – прыблізна 5–6 тысяч грыўняў (каля 230 долараў). Настаўнікі стараюцца атрымаць 1,5–2 стаўкі, каб зарабіць. Але выжываюць гарадзішчанцы пераважна за кошт лесу і гароду. Вось і Марыя свае 6 сотак засадзіла клубніцамі, якія возіць аж у Кіеў, дзе можна прадаць даражэй.

У Наталкі раз-пораз у размове праскокваюць беларускія словы, і я цікаўлюся – адкуль? Аказваецца, раней у Дубровіцы ішло беларускае тэлебачанне, і яна вырасла на калыханцы Генадзя Бураўкіна. Сёння дубровенцы БТ практычна не глядзяць, па спадарожніку часам ловяць «Белсат» – з-за беларускай мовы, якая прываблівае сваёй нязвыкласцю.

Пытаюся: чаго чакаюць украінцы ад новага прэзідэнта? Чаканні зусім простыя – каб у Кіеве перасталі красці, а на Данбасе страляць, каб можна было, як раней, ездзіць у Расію на заробкі. Украінскіх палешукоў (па маіх адчуваннях) мала цікавіць чарговая палітычная кампанія – парламенцкія выбары, якія, магчыма, адбудуцца ў наступным месяцы. Як палешукоў беларускіх – мінская мудрагелістая палітыка, якая на іх жыццё мала ўплывае. Жыхары Палесся жывуць – як Прыпяць плыве: павольна, з пачуццём глыбіннай сілы, не пераадольваючы перашкоды, а абмінаючы іх. Так і хочацца выгукнуць, стаўшы на мяжы: палешукі ўсіх краін, яднайцеся!

Жылі на Палессі будзіны

Что поделаешь, человек соткан из противоречий. Но доброта и внимание к проблемам близких ему людей были у него главенствующими качествами.

Когда у меня случилась беда, его не надо было просить о помощи: мол, Саша, съезди в Боровляны, отвези то и то. Он сам знал и помнил, когда надо побывать в больнице, передать нужное.

Добродушный, гостеприимный. Рыбак заядлый. Нам как министрам тогда выделили государственные дачи в Крылово. Он вместе с женой Валентиной Акимовной приезжал туда часто. У меня муж также заядлый рыбак. И они на этой почве сдружились. Стали соперничать, кто поймает самую крупную рыбину, чей улов окажется богаче… Когда ему не везло с клевом, он так переживал!.. Бил от досады удилищем по мосткам. **Но об этом пусть Анатолий Николаевич сам расскажет:**

– Мы только появляемся на даче – от него звонок, словно он в окне сидел и ждал. Сначала в трубке было характерное резкое покашливание, ни с кем другим не спутаешь. И сразу – в карьер:

– Так, пиво в холодильнике…

Это означало, что запланирован поход в баню, куда мы ходили семьями.

Однажды я не смог пойти с ним на зорьке на рыбалку. Уехал в город по каким-то делам.

Он днем звонит:

– Ты мне был нужен утром, как никогда! Я шестнадцать карпов поймал, еле дотащил до дома. 28 килограммов, не шуточки.

Я подумал: рыбаки любят прихвастнуть. Звоню его жене, уточняю. Она подтверждает. Сговорились, думаю. А потом услышал от других, что Александр действительно поймал 16 огромнейших карпов. Не сочинял, значит.

Оказавшись как-то в командировке в Лондоне, он тут же звонит мне:

– Слушай, я в рыболовном магазине. Купил тебе и себе замечательные крючки!

Умел Александр Васильевич ценить мужскую дружбу. Не обделял вниманием он и женщин.

…В ту пору я перевезла к себе свою старенькую маму. Ей в ту пору было 95 лет. По привычке так хотелось быть ближе к природе. И когда нас выселяли с государственной дачи, я выпросила в аренду небольшой гостиничный номер в том же Крылово.

Надо было видеть, как Александр приседал перед мамой, целовал ей руку, расспрашивал о настроении. А она ждала всегда этой встречи, когда же Александр Васильевич придет.

Компанией играют в бильярд. Дочь наша, Анатолий и Александр. Чтобы не проспать зорьку, играют до утра.

Старались никогда не пропускать рыбалку. Улов шел на совместную уху, обедали семьями вместе. Атмосфера была дружеской.

Когда Сашу настигла неожиданная отставка с поста министра, он впал в глубокую депрессию. Морально ему было тяжело. Мы по-прежнему поддерживали дружеские отношения. Как правило, никогда не вели разговоров о служебных делах, их оставляли за кадром. Говорили о детях, родителях, рыбалке, спорте…

Я часто вспоминаю тот день, когда прощались с Александром Васильевичем. И думаю: его не просто лишили должности, его лишили возможности работать.

И он потерял смысл жизни. Как дерево, вытащенное из земли. Лежит вверх корнями и вынуждено засыхать. Выбросили в никуда.

На похоронах, помню, выступил один коллега по Верховному Совету и сказал:

– Так не должно быть. Это бесчестно и бессовестно.

Инесса ДРОБЫШЕВСКАЯ, депутат Верховного Совета 12-го созыва, экс-министр здравоохранения.

...По одному округу

Так выпало, что мы с Александром Лукашовым сражались за мандаты депутатов Верховного Совета в одном округе. Он в Червене работал директором автобазы, я же решил зарегистрироваться на «малой родине».

Кандидатов было более десяти. Среди них – первый секретарь райкома партии Александр Метельский. Конкуренцию ему составляли председатель колхоза, председатель Комитета народного контроля, руководитель райсельхозтехники… *Тузін смелых.* Победил в избирательной кампании по нашему округу директор районной автобазы Александр Лукашов. Не скажешь, чтобы он чем-то особенным отличался. Все как надо: высокий, молодой, с обаятельной улыбкой… Идея в основном была такой: «завалить» первого секретаря, не дать ему вырваться в депутаты. Тогда вообще единую «руководящую и направляющую» партию критиковали все кому не лень. К тому же Александра Метельского не очень-то принял червенский люд. И сам он, очевидно, приехал в район на должность первого секретаря без желания. Еще бы: отучился в Москве, в Академии общественных наук при ЦК КПСС, а его с самым престижным дипломом отправили в Червень, хотя перед учебой он занимал такую же должность в Узде.

Среди кандидатов образовалась группа из пяти человек, которые договорились: не важно, кто из нас победит, но нужно во что бы то ни стало преградить путь Метельскому, а поэтому будем действовать вместе.

Так и получилось. В результате победил Александр Лукашов.

В шоферском коллективе его уважали и дружно помогали во время избирательной кампании. Подчиненные Лукашова с утра заводили автобус (в автобазе транспорта хватало), заполняли его молодыми людьми с гармошкой и бубном, брали красивых певуний и ездили от одной деревни к другой. На концерт люди сбегались, бросая любую работу. В дополнение к песням и танцам – обещания. К вам рейсовый автобус не ходит? Как только Лукашов станет депутатом – пойдет. Редко ходит? Будет ходить чаще! Плохой автобус? Завтра приедет лучший! Хлеб не завозят? Да мы вам на автобазовской машине привезем! И никаких *праклёнаў* в адрес коммунистов, никаких пламенных призывов во имя демократии, конституционных свобод.

Правда, обязательство выступать против первого секретаря обкома партии Лукашов выполнял.

Так он стал депутатом Верховного Совета 12-го созыва. По правде, он не рвался ни на трибуну, ни к вольному микрофону в проходе. Готов был во время сессии давать комментарии на любую тему, но только в кулуарах, не для прессы.

Лукашов сразу же присоединился к команде Лукашенко. И во время президентской кампании активно помогал ему. Крутил без устали баранку легковика. При этом, замечу, он, бывало, мог похвалиться военным билетом, в котором было записано, что хозяин документа – майор Комитета госбезопасности. Кстати, после победы Лукашенко на президентских выборах Лукашов (удивительное созвучие фамилии!) претендовал на должность председателя КГБ. Было ли это официально? Не могу утверждать, но как-то мимолетно он мне об этом сказал.

Александр Лукашов получил должность министра транспорта. Правда, из этого ведомства был создан хозяйственный монстр. В одну кучу собрали железную дорогу, аэрофлот, систему автобусных маршрутов и все автомобильные организации, а также дорожно-строительные и военные железнодорожные батальоны, речное пароходство. Александр Лукашов был министром более семи лет. Долго. Отмечали одну его черту: Лукашов охотно отвечал на любой звонок телефона городской АТС без посредничества секретарш и референтов. И по мере возможности старался исполнять просьбу.

Я звонил ему редко, какие общие дела могли быть у снятого с должности главного редактора газеты и министра? Но каждый раз он спрашивал: когда зайдешь? Пару раз я сопровождал к нему земляков, у которых были какие-то вопросы. Их министр толково решал.

Во время одной из встреч Лукашов предложил мне должность редактора газеты Министерства транспорта. «Я знаю, кто тебя выгнал с работы и за что, – сказал он, – меня это не волнует. Все проблемы решу сам!» «Хорошо, но на сегодняшний день у вас есть редактор, им является мой приятель Женя Татур. Куда он денется?» «Тебе он хороший приятель, а министерство не один раз подводил!» «Не, Саша, – ответил я министру. – Таким образом я не хочу устраиваться к вам на работу!»

После освобождения с должности министра Александр Лукашов был в депрессии, так говорили его близкие соратники. И однажды как будто в присутствии еще одного члена избирательной команды Виктора Кучинского он сказал: «Пусть никто не думает, что я забыл про то, что знаю».

Спустя непродолжительное время из Уручья, где жил Лукашов, пришла трагическая весть: бывший министр вроде выпрыгнул из окна многоэтажного дома на асфальт. Друзья провели собственное расследование и пришли к выводу, что на самоубийство не совсем похоже…

Его похоронили на Московском кладбище, в той части, где место нужно было выкупать. Недалеко от могилы Лукашова покоится прах генерала Евгения Бочарова, в прошлом командира десантной дивизии, участника афганской войны, командующего Пограничными войсками. Характерно, что он также умер до поры. В его биографии был оппозиционный штрих: Бочаров руководил избирательным штабом генерал-полковника Козловского, оказавшегося позже неугодным властям.

Николай ГАЛКО, журналист.

СЛЫШАЛИ?

Пять президентов наградили Юрия Шевцова

Решение о награждении медалью за вклад в развитие Евразийского экономического союза принимает Высший совет, в состав которого входят президенты России, Армении, Беларуси, Казахстана и Киргизии.

«У меня есть награды некоторых государств, даже медаль от президента одной страны НАТО и ЕС, – прокомментировал новость Юрий Шевцов. – *Но от пяти президентов сразу… По-моему, это вообще единственная награда с таким статусом».*

Правда, медаль пока не вручили – лишь недавно было подписано решение о награждении. Не исключено, что торжественное вручение медали состоится 21 июня, когда в Минске пройдет заседание Совета ЕЭК.

ИЗ ЛИЧНОГО ДЕЛА

Юрий Шевцов родился 29 июля 1966 года в Брестской области. Окончил истфак БГУ.

1991–1998 гг. – научный сотрудник Отдела истории и теории культуры Института искусства и культуры АН Литвы. Специализировался на разработке теоретических вопросов развития культуры и политических систем в регионе Средней Европы.

1994–1996 гг. – преподаватель Института политических наук и международных отношений Вильнюсского государственного университета.

1995—1996 гг. – руководитель международных программ Центра стратегических инициатив «Восток-Запад» (Минск).

1998–2005 гг. – директор Центра по проблемам европейской интеграции Европейского гуманитарного университета (Минск).

Участвовал в разработке ведомственных научно-исследовательских программ по линии Министерства иностранных дел, Минэкономики, Совмина РБ, ОБСЕ.

Женат. Имеет троих детей. Кандидат наук.

Галина РУТ.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Сергей Калякин предлагает ввести семичасовой рабочий день

С инициативой перейти на 35-часовую рабочую неделю политик выступил на очередном съезде Белорусской партии левых «Справедливый мир».



– Сергей Иванович, некоторые обвинили вас в популизме перед парламентскими выборами…

– А в чем популизм-то? Сегодня есть много стран, в которых уже ввели шестичасовой рабочий день. В том числе и во Франции. И французы тоже вначале говорили о популизме, а сейчас всем всё нравится, отлично живут! В Венесуэле тоже шестичасовой рабочий день.

Вообще, сегодня есть много научных разработок на эту тему. В идеале должна быть 21-часовая рабочая неделя. Тогда люди действительно смогут почувствовать вкус жизни. Сейчас большинство белорусов как живут? День проводят на работе, потом приходят домой, ужинают, делают какие-то дела по дому и спать. Времени на саморазвитие, воспитание детей, общение и прочие удовольствия практически нет.

Человек должен жить не для того, чтобы работать!

– А некоторые работодатели до сих пор считают, что работать нужно круглосуточно…

– Уже давно доказано, что при сокращенной рабочей неделе повышается производительность труда. На мой взгляд, строго ограниченный временем рабочий день скоро вообще не будет актуальным. Многие уже сегодня работают дома, удаленно. И при этом эффективно!

Сторонники 21-часовой рабочей недели считают, что такой подход к работе может решить сразу несколько проблем: безработицу, чрезмерное потребление, неравенство. Сокращенная рабочая неделя изменит принцип, когда все живут, чтобы работать, а работают, чтобы зарабатывать, чтобы потреблять.

Идеи о том, что нужно сокращать рабочий день, не новы. А так у нас получается, что некоторые работают 12 часов, но платят им как за 8!

– Да, на зарплате сокращение рабочего дня сказаться не должно.

– Мы как раз и ведем речь о том, чтобы, работая 7 часов, человек зарплату получал как за 8.

На пленуме у нас по этой теме были очень серьезные баталии. Процентов 40 членов ЦК нашей партии выступали за то, чтобы перейти на 6-часовой рабочий день. Но мы решили идти поэтапно. Хотя 6-часовой рабочий в Беларуси – это тоже возможно! При повышении производительности труда за 6 часов реально сделать столько же, сколько и за 8.

Мы будем рассказывать людям о сокращении рабочей недели, будем говорить об этом во время парламентской и президентской кампаний. Ясно, что это не быстро введется, но работать в этом направлении нужно! Пусть люди в конце концов задумаются, можно ли сократить их рабочий день.

КСТАТИ

«К костылям уже привык!»

Около двух недель назад Сергей Калякин неудачно споткнулся и сломал ногу. Причем поначалу перелома он не заметил и к врачам обратился лишь на следующий день, когда нога уже прилично распухла.

Врачи пообещали Сергею Калякину, что снимут гипс в конце июня.

«К костылям уже привык! – говорит Сергей Иванович. – *Человек ко всему привыкает. Ничего хорошего, конечно, в этом нет, и летом в гипсе – не самое лучшее развлечение. Вчера сходил на снимок – слава Богу, все срастается, как нужно. Доктора сказали, что еще пару недель осталось потерпеть…»*

Марина КОКТЫШ.

ЛІЧБЫ

Азалаціліся

Золатавалютныя рэзервы Беларусі на 1 чэрвеня 2019 года склалі 8 млрд 90 млн долараў.

Як паведамляе Нацыянальны банк, гэта максімальнае значэнне за апошнія шэсць гадоў. За май 2019 года золатавалютныя рэзервы выраслі на 521,6 млн долараў ЗША (на 6,9%) пасля росту ў красавіку 2019 года на 322,7 млн долараў ЗША (на 4,5%).

ЧУЛІ?

«Волга» Івана Мележа пойдзе з малатка

На адным з мінскіх аўкцыёнаў выстаўлены на продаж незвычайны лот –аўтамабіль «Волга-21», які належаў класіку беларускай літаратуры Івану Мележу. Паводле сведчання дачкі пісьменніка Ларысы, на ёй Іван Паўлавіч неаднаразова выязджаў на Палессе, дзе збіраў матэрыялы для сваіх раманаў «Людзі на балоце», «Подых навальніцы» і «Завеі, снежань». У апошнія гады жыцця Мележ рэдка ездзіў за рулём сам – з-за ранення ў руку, атрыманага на вайне, быў вымушаны карыстацца паслугамі шафёра. Перад аўкцыёнам аўто было грунтоўна адрэстаўравана спецыялістамі.

Антон ЗАГОРСКІ.

ТРАГЕДЫЯ

Пакаталіся…

У Іванаўскім раёне ў ДТЗ загінуў 5-гадовы пасажыр мапеда.

На закругленні дарогі 26-гадовы мінчанін, які кіраваў мапедам і вёз 5-гадовае дзіця, не справіўся з кіраваннем і на сустрэчнай паласе сутыкнуўся з грузавіком.

Вадзіцель застаўся жывы, а вось маленькі пасажыр памёр у бальніцы.

НЕЗАШОРАНЫМ ВОКАМ

Міністэрства адукацыі… ці імітацыі?

У беларускіх школах адзвінелі, або і адгрымелі, апошнія званкі; тысячы маладых людзей сабраліся паступаць далей у розныя навучальныя ўстановы ў Беларусі і за мяжою, а вялікая колькасць беларускіх настаўнікаў на гэтым і наступным тыднях ужо сыходзіць у адпачынак. Трэба схіліць галаву перад нашым Міністэрствам адукацыі, якое ў супрацоўніцтве з мясцовымі ўладамі гераічна дамаглося забароны продажу алкаголю па ўсёй Беларусі, гэтым разам аж на чатыры дні (апошнія званкі гучалі 29 і 30 мая, а выпускныя вечарыны адбываліся 8 і 9 чэрвеня). Вядома, нехта можа задаць пытанне: а чаго ж вартыя ўсе намаганні міністэрства, якое дае рэгулярныя справаздачы пра свае поспехі ў выхаваўчай працы сярод падлеткаў і юнакоў, калі гэтае ведамства такое няўпэўненае, скажам так, у цвярозым ладзе жыцця сваіх выхаванцаў і выхаванак?.. Але не будзем займацца ёрніцтвам («усе ўсё разумеюць…»), а пагаворым пра больш сур'ёзныя рэчы. Як я ўжо казаў, вялікая колькасць беларускіх настаўнікаў (у большасці, вядома, прадстаўніц прыгожага полу) або ўжо адправілася або неўзабаве адправіцца ў заслужаны летні адпачынак. Што цяпер у галовах гэтых людзей, якія правялі чарговы навучальны год, запоўнілі масу абавязковых і неабавязковых папер, напісалі і падалі вусна гару ўсялякіх справаздач? Мяркую, што не толькі тое, што іх праца ацэньваецца дарагой дзяржавай зусім не так, як было б трэба: мала хто можа дазволіць сабе ўлетку адпачыць на не самых танных курортах…

Я сам паводле сваёй прафесіі настаўнік і добра ведаю, што, калі ідзеш у летні адпачынак, адразу пачынаеш думаць пра наступны навучальны год: як там і што будзе, што трэба пачытаць, паглядзець, каб належным чынам да яго падрыхтавацца. Каб падрыхтавацца належным чынам, трэба, вядома ж, ведаць, прынамсі, якія праграмы, якія падручнікі будуць у цябе ў карыстанні ў наступным годзе.

Гэтым разам згаданае міністэрства парупілася, каб настаўнікі рыхталіся да новага навучальнага года, што называецца, усляпую. Сёння (пішу гэтыя радкі раніцай 10 чэрвеня) я чарговы раз зазірнуў на афіцыйны міністэрскі сайт (edu.gov.by). І знайшоў два загады аб зацвярджэнні вучэбных планаў сярэдняй агульнаадукацыйнай школы… на 2018/19 – гэта значыць на мінулы – навучальны год. Плана на наступны, 2019/20, год як не было, так і няма! На сайце знайшоў цэлы раздзел, прысвечаны пачатку навучальнага года, *якія ўжо скончыўся.*

А між іншым, з верасня ўсе дзявятыя, завяршальныя ў базавай школе, класы пераходзяць на новы змест навучання. Тлумачу ў сувязі з гэтым: большасць вучэбных прадметаў у гэтым класе, відавочна, будзе мець новы, часам вельмі істотна зменены змест і ў нейкіх выпадках іншую колькасць гадзін на засваенне гэтага зместу. Але ж вучэбны план, як ужо казалася, міністэрства па-ранейшаму трымае ў сакрэце; нават на афіцыйным сайце няма новых вучэбных праграм, а з запланаваных паўтара дзясятка новых падручнікаў для 9-га класа з'явіліся толькі рускамоўныя версіі дапаможнікаў па алгебры і фізіцы! Пры гэтым вучні 8-га класа наогул так і не атрымалі ў мінулым навучальным годзе свайго падручніка па геаграфіі (і гэта ў тым выпадку, калі вучэбная праграма была радыкальна зменена). Настаўнікі, якія выкладалі ў школах чарчэнне, так дакладна і не ведаюць, будзе гэты прадмет у вучэбным плане наступнага года ці не, трэба або не трэба арыентаваць вучняў на набыццё наогул нятанных працоўных сшыткаў, альбомаў, чарцёжных інструментаў да наступнага навучальнага года. Сайт нацыянальнага інстытута адукацыі (www.adu.by) таксама на ўсе гэтыя тэмы сціпла маўчыць, а прапануе вывучаць анлайн навучальны працэс… у 2018/19 навучальным годзе (дзякуй, ужо вывучылі!).

Пра што ж сёння бадзёра рапартуе міністэрскі сайт? Вось толькі некаторыя загалоўкі: «У Беларусі дзейнічае эфектыўная сістэма падтрымкі маладых талентаў» (хацелася, каб так было!), «Беларуска-японская акцыя «За мир и честный спорт» (ах, як жа гэта важна для нашых педагогаў!), «Міністр адукацыі І.Карпенка наведаў навучальныя ўстановы Лёзненскага раёна» (і тлумачыў тамтэйшым настаўнікам «сучасныя методыкі карэкцыйна-развіццёвага навучання»), «Міністр І.Карпенка наведаў Полацкае кадэцкае вучылішча» (відавочна, прадэманстраваўшы там свае здольнасці ў разуменні будучыні вайсковай справы ў Беларусі). З міністэрскага сайта мы даведаемся, напрыклад, і пра тое, што, аказваецца, некалькі дзён таму «делегация из Федеративной Республики Нигерия (Штата Екити), находящаяся в нашей стране с визитом, посетила учреждения профессионально-технического образования столицы (филиал «Колледж современных технологий в машиностроении и автосервисе» учреждения образования «Республиканский институт профессионального образования» и УО «Минский государственный профессиональный лицей №5 транспортного строительства»). Натуральна, вельмі важна, што нашы працаўнікі на ніве прафесійнай адукацыі шчодра дзеляцца сваім досведам падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы арганізацыі аўтасэрвісу з прадстаўнікамі афрыканскай краіны, але, падазраю, нашы настаўнікі чакаюць нейкай іншай, больш для іх важнай інфармацыі, для таго каб паспяхова пачаць новы навучальны год. Бо лета, як заўсёды, праляціць незаўважна…

Успамінаецца савецкі анекдот брэжнеўскага часу: цягнік з генсекам Брэжневым раптоўна спыняецца і ніхто не ведае, ці паедзе далей, а Брэжнеў прапануе: «Няхай ахова выйдзе з вагона і пачне яго раскалыхваць – няхай усе думаюць, што мы едзем!»

Вось і цяпер нешта навязліва падштурхоўвае мяне прыдумаць новую назву для айчыннага Міністэрства адукацыі – ці не перайменаваць яго, да прыкладу, у «міністэрства імітацыі»?

Лявон БАРШЧЭЎСКІ.

СТОП-КАДР

Старт дадзены!

Урачыстая цырымонія памятнага гашэння мастацкай паштовай маркі «*Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М.Аляксандрава. Жыццё варта таго, каб за яго змагацца*» прайшла ў РНПЦ. Падзея атрымалася ўрачыстай, у мерапрыемстве прынялі ўдзел міністр сувязі і інфарматызацыі **Канстанцін Шульган**, міністр аховы здароўя **Валерый Малашка**, дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі **Алег Суконка**, гендырэктар РУП «Белфармацыя» **Валянціна Ігнаценка** і дэпутат Палаты прадстаўнікоў **Людміла Макарына-Кібак**.

Як раней пісала «Народная Воля», выданнем гэтай маркі Міністэрства сувязі і іфарматызацыі адкрыла серыю «Дасягненні беларускай медыцыны».

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.



СТАЛА ВЯДОМА

Без аплаты ...

Уладальнікі транспартных сродкаў з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай не больш як 3,5 т з прычэпамі з 10 чэрвеня па 10 ліпеня вызваляюцца ад платы за праезд па платных аўтамабільных дарогах Беларусі. Гэта прадугледжана ўказам № 292.

На гэты перыяд уладальнікам названай катэгорыі транспартных сродкаў не трэба заключаць дагавор карыстання платнай аўтамабільнай дарогай, рэгістраваць транспартны сродак у сістэме BelToll і ўстанаўліваць на транспартны сродак устройства электроннай аплаты. Калі ў вадзіцеля ўжо ёсць дагавор, аператар раіць змясціць устройства электроннай аплаты ў ахоўную ўпакоўку (металізаваны пакет), інакш пры праездзе пад станцыямі збору платы яно будзе падаваць гукавыя сігналы. Пры гэтым спісанне грашовых сродкаў з рахунку праводзіцца не будзе.

РАДАВОД

Князёўна Эльжбета Друцкая-Любецкая ўпершыню наведала Беларусь

Яе продкі жылі ў Шчучыне. Дачка апошняга ўладальніка палаца Друцкіх-Любецкіх піша кнігу пра гісторыю свайго роду і вельмі ўдзячная лёсу, што змагла наведаць радзіму продкаў.

Першыя ўражанні

Пані Эльжбета *(на фота)* ўсяго некалькі дзён прабыла ў Гродне, і ў польскім консульстве ёй арганізавалі сустрэчу з журналістамі. Было відавочна, што яна перапоўнена ўражаннямі і імкнецца не столькі распавядаць пра сябе, колькі слухаць іншых. У яе запыталіся пра першыя ўражанні ад Беларусі, а князёўна пачала з таго, што сказала: «*Гродна мяне ўразіў, але самае цікавае: калі слухаю мову беларускую, то разумею, што гэта не па-руску і не па-польску, але гэта так блізка майму сэрцу!*».

Госця размаўляла з журналістамі па-польску, а ўвогуле валодае яшчэ французскай, англійскай і рускай мовамі. Жыве ў Брусэлі, там яе сям'я, дзеці і ўнукі.



Нашы бацькі не хацелі ўзгадваць аб радзіме

У 1939 годзе апошнія ўладальнікі палаца ў Шчучыне пакінулі горад і спыніліся ў Варшаве, дзе ў 1943 годзе і нарадзілася Эльжбета. У 1945-м сям'я вымушана была ўцякаць з Варшавы, паколькі горад займалі бальшавікі. У цягніку Эльжбеце споўнілася два гады.

Спачатку Друцкія-Любецкія трапілі ў Германію, але жыццё там сям'я не ўяўляла. Пераехалі ў Францыю, жылі, паводле ўспамінаў пані Эльжбеты, у даволі складаных умовах, а пазней перабраліся ў Бельгію, дзе і спыніліся назаўсёды.

«Калі мы пакінулі Польшчу, то для маіх бацькоў радзіма як бы перастала існаваць – там былі бальшавікі, і бацькі не хацелі нават пра гэта гаварыць. Яны не жадалі нічога ўзгадваць аб тых мясцінах, дзе раней жылі, – дзеліцца князёўна Эльжбета. – *Для нас, дзяцей, гэта было вельмі складана, бо ні на якія пытанні адносна нашай радзімы бацькі не хацелі адказваць. Таму мы вельмі мала ведаем пра мінулае нашага роду на гэтых землях».*

У пані Эльжбеты было чатыры сястры, і пры жыцці яны цікавіліся гісторыяй свайго роду.



Палац Друцкіх-Любецкіх у Шчучыне.

Але толькі яна носіць прозвішча сваёй сям'і, паколькі лічыць гэта важным для сябе.

Эльжбета Друцкая-Любецкая прыехала ў Беларусь, каб як мага болей даведацца аб сваіх продках на зямлі, дзе яны некалі жылі. Дарэчы, яна адносна нядаўна даведалася, што ў беларускім Шчучыне застаўся палац, які збудаваў яе продак і які нядаўна адрэстаўраваны.

Князь **Францішак-Ксаверый Друцкі-Любецкі**, які пэўны час быў паслом у Францыі, вярнуўшыся ў 1807 годзе на радзіму, дазволіў сабе такую экстравагантнасць: перабудаваў палац, атрыманы ў спадчыну жонкай Марыяй Сцыпіён дэль Кампа, накшталт Малога Трыанона ў Версалі, дзе месцілася рэзідэнцыя французскіх каралёў.

Дарэчы, Францішак-Ксаверый быў міністрам фінансаў Польскага Каралеўства. А яшчэ ён стварыў праект Аўгустоўскага канала, які дагэтуль дзейнічае і прыцягвае мноства турыстаў з розных краін. Князёўна Эльжбета даведалася аб гэтым толькі ў Гродне.

Вельмі сціпла пра сябе

Як ні імкнуліся журналісты пабольш даведацца пра асобу князёўны Эльжбеты, яна вельмі сціпла і каротка пра гэта гаварыла.

У яе чатыры дачкі і ўнукі. Жыве ў Брусэлі, займаецца грамадскай дзейнасцю, скіраванай на абарону жыцця і забарону абортаў.

Узгадала, што яе бацька кожны вечар маліўся перад крыжам. Шкадуе, што многія народы цяпер прыбралі Бога са свайго сэрца.

Распавяла журналістам, што ў яе планах напісаць кнігу аб сваім родзе, таму яна і збірае інфармацыю аб Друцкіх-Любецкіх. Ужо напісана 200 старонак тэксту, ёсць дзясяткі цікавых фотаздымкаў.

Перад паездкай князёўны ў Шчучын гродзенскія журналісты пацікавіліся, з якім пачуццём яна едзе туды?

«Спадзяюся, што для мяне гэта будзе сюрпрыз, таму што пра гэты горад і палац мы даведаліся ўсяго гадоў 20 таму, – адказала пані Эльжбета. – *Вельмі хочацца даведацца як мага больш. Магчыма, у Шчучыне захаваліся архівы і можна знайсці больш інфармацыі пра мой род».*

Гісторыяй свайго роду пані Друцкая-Любецкая цікавілася заўсёды і кнігу вырашыла напісаць, каб ушанаваць памяць сваіх продкаў, якімі яна ганарыцца.

«Мае дзеці яшчэ маюць нейкія веды пра наш род, а ўнукі ўжо амаль нічога не ведаюць, бо ў Бельгіі нечым падобным цяпер ніхто не цікавіцца, – заўважае пані Эльжбета. – *І таму я проста павінна напісаць гэту кніжку, каб захаваць памяць для наступных пакаленняў».*

Міхал КАРНЕВІЧ.

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

Зборная Беларусі гуляе стабільна. Без перамог

Сёння беларускія футбалісты правядуць надзвычай важны матч.

У мінулую суботу нацыянальная каманда прайграла трэцюю гульню запар у кваліфікацыі чэмпіянату Еўропы–2020. Безумоўна, знайшлося няшмат аптымістаў, якія верылі ў перамогу ці хаця б нічыю беларусаў у матчы са зборнай Германіі, нягледзячы на тое, што наша каманда гуляла на дамашнім полі.

Дарэчы, «Барысаў-Арэна» не была запоўнена пад завязку, хаця раней прагназаваўся аншлаг. Відаць, пастаянныя паразы зборнай настолькі зняверылі балельшчыкаў, што тыя ігнаруюць нават матчы з удзелам зорак сусветнага футбола. А яшчэ славуты варатар нямецкай каманды Мануэль Ноер быў вельмі здзіўлены тым, што частка беларускіх балельшчыкаў падтрымлівала зборную Германіі.



«Безумоўна, гэта вельмі прыемна, што столькі людзей скандзіравалі «Германія!» і вялі нас наперад, – цытуе галкіпера football.by. – *Калі шчыра, то гэта некалькі нечакана. Я заўважыў, што многія былі не немцамі, але гэта не мае значэння. Падтрымка была неверагоднай, было адчуванне, што мы гуляем дома. Толькі я аднаго не разумею – як можна балець супраць сваёй краіны?»*

Беларускі футбаліст **Максім Валадзько** таксама працягнуў у сацыяльных сетках гэтую тэму: «*Я разумею, што каманда гуляе не лепшым чынам, няма выніку. Але давайце мы падумаем, як нам лепш гуляць, а вы падумайце, як не балець за чужую краіну. Ніхто не просіць рваць за нас глоткі, але не рвіце іх хаця б за каманды сапернікаў*».

Адным словам, на бяззубую гульню футбалістаў балельшчыкі адказалі своеасаблівым пратэстам, хаця, шчыра кажучы, зборная знаходзіцца на сваім узроўні, а вышэй галавы не скочыш.

А вось сёння беларуская каманда згуляе адзін з самых важных матчаў з Паўночнай Ірландыяй, бо, калі і зараз прайграе, то дагнаць цягнік будзе ўжо практычна немагчыма.

На сённяшні момант турнірнае становішча ў групе такое: Паўночная Ірландыя – 9 ачкоў (3 гульні), Германія – 6 (2), Галандыя – 3 (2), Эстонія – 0 (2), БЕЛАРУСЬ – 0 (3).

Алесь СІВЫ.

II ЕВРОПЕЙСКИЕ ИГРЫ

С комфортом!

Премьер-министр Греции Алексис Ципрас предоставит собственный министерский самолет для полета национальной сборной страны по легкой атлетике на Европейские игры в Минске.

Ранее Федерация легкой атлетики Греции объявила об отмене участия сборной страны в соревнованиях из-за того, что невозможно было найти и купить авиабилеты для полета в Минск, обвинив Национальный олимпийский комитет Греции в запоздалом предоставлении информации.

Не курить, не пить…

Будущих волонтеров Европейских игр познакомили со спецификой работы на стадионе «Динамо».

Их предупредили, чтобы они не забывали дома аккредитационную карточку и брали с собой полный комплект формы. Также собравшихся настоятельно попросили на работе не курить, не принимать алкоголь и наркотики, не делать ставки и не перепродавать билеты, не раскрывать конфиденциальную информацию, информирует minsknews.by. Запрещено обращаться к спортсменам, медийным личностям и другим VIP-персонам с просьбой об автографах и совместных фото.

В противном случае они будут отстранены от выполнения своих обязанностей.

Протестировали

На прошлой неделе в Студенческой деревне, где во время Игр будут жить спортсмены, массово протестировали работу столовой на две тысячи человек.


К процессу были привлечены студенты столичных вузов. Их задача была прийти в указанное время и поесть, сообщает tut.by. Столовая масштабная: площадь зала – 5,5 тысячи квадратных метров, он рассчитан на 2 тысячи посадочных мест. Похожие столовые работали на крупнейших международных соревнованиях – на Олимпийских играх в Сочи и Европейских играх в Баку.

КРЫЖАВАНКА

Сямейная згода – багацце

Па гарызанталі: 2. … рада вясне, а дзіця – маці (прык.); 13 мая – Міжнародны дзень маці. 5.Прымаўка – кветачка, прыказка – … (прык.). 10.Нашто …, калі ў сям'і лад (прык.); 15 мая адзначаецца Міжнародны дзень сям'і. 11.«Больш, чым … на небе, // Дзецям мамачка патрэбна» – З верша Л.Андрэевай «Матуля». 12.«Добры … – гэта сонечнае святло ў доме» (У.Тэкерэй). 13.У маі … халады : калі чаромха цвіце, і калі дуб распускаецца (прыкм.). 14.«Падай, мамачка, пілу, // Я рабіначку спілю. //На рабіне жоўты ліст, // Мяне кінуў …» (прыпеўка). 15.Добры … – усяму свету міл (прык.). 18. … у сям'і на адной любві трымаецца (прык.). 19. … лясы прыбірае, лета ў госці запрашае (прык.). 22.Вершаваная двухскладовая стапа. 24.«Першы …, які дае нам маці, – гэта жыццё, другі – любоў, трэці – разуменне» (Д.Браўэр). 28.Стары сасновы лес. 29.«У садочку май, // Май, духмяны … , // І ўсю ночку несціханы // Салаўіны свіст» – з верша М.Танка «У садочку май». 30.«Быў якраз … мая.// Ну й была тады вясна!» – з паэмы Я.Коласа «Сымон-музыка». 31.Вялікае …, калі сям'я ў разладзе (прык.). 32.Лепш маці на мыліцах, чым … на кані (нарвежская прык.). 33. Майскі … згоніць з печы (прык.).

Па вертыкалі: 2.«Зелянее … ў полі, // У небе птушачкі пяюць» – з верша М.Чарота «Вясенняя раніца». 3.Каробка, у якую змяшчаецца магнітная стужка. 4.Сям'я без дзяцей, што … без паху (прык.). 6.Адзінка вымярэння вугла. 7.«Сям'я – гэта …, які вядзе нас» (Б.Генры). 8.Тое, што ўкладзена ў пэўным парадку. 9.Той, хто беражэ, шануе каго-небудзь. 16. … маці грэе лепш сонца (прык.). 17. … без вады мёртвая, чалавек без сям'і – пустацвет (прык.). 20.Для ўнука … – розум, а бабуля – душа (прык.). 21. І ў добрай сям'і … бывае (прык.). 23.Прылада для рыбы. 25.Тое, што асыпалася з гары. 26.Маладыя расліны, прызначаныя для перасадкі іх у адкрыты грунт. 27.У антычным свеце жрэц-прадказальнік. 28.Саловей зашчоўкаў, значыць, … распусцілася (прыкм.).



Адказы на крыжаванку

Па гарызанталі: 1.Птушка. 5.Ягадка. 10.Клад. 11.Сонейка. 12.Смех. 13.Два. 14.Гарманіст. 15.Сын. 18.Мір. 19.Май. 22.Ямб. 24.Падарунак. 28.Бор. 29.Ліст. 30.Пачатак. 31.Гора. 32.Бацька. 33.Клопат.

Па вертыкалі: 2.Траўка. 3.Касета. 4.Кветка. 6.Градус. 7.Компас. 8.Укладка. 9.Ахоўнік. 16.Сэрца. 17.Зямля. 20.Дзядуля. 21.Вырадак. 23.Блясна. 25.Асыпак. 26.Расада. 27.Аракул. 28.Бяроза.

Лявон ЦЕЛЕШ.
г. Дзяржынск.

РЕЗОНАНС

Учитесь грамоте!

Минчане заметили, что перед Европейскими играми на официальном сайте мероприятия названия улиц Минска на английский перевели неточно.

По этому поводу белорусы написали петицию, которую опубликовали на сайте «Удобный город». Обратившиеся посчитали, что неверная подача информации вводит в заблуждение иностранцев.

Петиция была направлена в Государственный комитет по имуществу, а также в Министерство спорта и туризма Беларуси.

Министерство спорта Беларуси пообещало, что впредь любая транслитерация будет соответствовать правилам, но все «произведения», которые успели создать к этому моменту, не переделают: повторно изготовить их до начала соревнований попросту невозможно.

ШАХМАТЫ

Праз усё жыццё

Сёлета спаўняецца 95 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага шахматнага кампазітара Уладзіміра Траяноўскага (1924–1999). Уладзімір Ільіч нарадзіўся ў Гомелі. Значную частку жыцця правёў у Клімавічах, працаваў эканамістам. Складаць задачы пачаў яшчэ ў школьныя гады, у 1939-м тры яго кампазіцыі атрымалі адзнакі на ўсесаюзным конкурсе для піянераў і школьнікаў, якія ладзіла газета «Пионерская правда». Апублікаваў больш за 250 задач, трэцяя частка з іх адзначана ў конкурсах. Фіналіст двух першынстваў СССР, прычым у пятым першынстве ўвайшоў у дзясятку лепшых у раздзеле трохходовак. Паспяхова выступаў у складзе зборнай рэспублікі ў камандных чэмпіянатах Савецкага Саюза: задачы Траяноўскага некалькі разоў займалі прызавыя месцы. Ён быў бронзавым прызёрам трэцяга першынства Беларусі ў раздзеле двухходовак.

Вось адна з задач У.Траяноўскага ***(гл. дыяграму)***.



Белыя: Крh4, Фf6, Лd1, Ле8, Са3, Са4, Кс3, Ке5, пп. d2, f3 (10).

Чорныя: Крd4, Лb4, Кb7, Кh3, пп. b6, d6 (6).

Мат за 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі ***(220030 г.Мінск, вул.Энгельса, 34а)*** або на электронны адрас: ***vadim_ne67@mail.ru.***

Сумесная задача

У конкурсе газеты «Вечерний Петербург» наступная кампазіцыя Віктара Волчака (Беларусь) і Леаніда Макаронца (Ізраіль) адзначана другім ганаровым водгукам.

Белыя: Кра2, Фе1, Лс6, Лf1, Кb5, Кg2, пп. d5, e4 (8).

Чорныя: Крe5, Фb8, Лg5, Сb7, Сg7, Ка3, Ке8, пп. а5, b6, c3, d3, f7, g4 (13).

Мат за 3 хады.

1.Ке3! ~ 2.К:g4+ Л:g4 3.Лf5х, 1...Кf6 2.Ф:с3+ Кр:е4 3.Фd4х, 1...Кd6 2.Фg3+ Кр:е4 3.Фf4х, 1...К:b5 2.Кс4+ Крd4 3.Фе3х, 1... Кр:е4 2.Кf5+ Кр:d5 3.Ке7х, 1...Сс8 2.Лс4 К:с4 3.К:с4х (1...Фс8 2.Фg3+ Кр:е4 3.Фf4х).

Перамогі гросмайстра

У мінулым выпуску мы распавялі пра выступленне нашых шахматыстаў на сёлетнім чэмпіянаце Еўропы ў Македоніі. Прапануем дзве пераможныя партыі беларускага гросмайстра з гэтага спаборніцтва.

Драган Шолак (Турцыя) – Уладзіслаў Кавалёў

1.е4 е5 2.Кf3 Кс6 3.d4 ed 4.К:d4 Кf6 5.К:с6 bc 6.е5 Фе7 7.Фе2 Кd5 8.с4 Кb6 9.Кс3 Фе6 10.Фе4 g6 11.Сd2 Сb7 12.Сd3 Сg7 13.0-0 0-0 14.с5 Кd5 15.f4 Фе7 16.Фс4 а5 17.Ке4 Са6 18.Фс2 С:d3 19.Ф:d3 f5 20.ef К:f6 21.Фс4+ Фf7 22.Ф:f7+ Л:f7 23.Лае1 Кd5 24.Сс3 Л:f4 25.Л:f4 К:f4 26.Лd1 Кd5 27.С:g7 Кр:g7 28.Кс3 Кf6 29.Крf2 Ле8 30.а3 Крf7 31.b4 аb 32.аb Лb8 33.Лd4 Кре6 34.g4 Кре5 35.Кре3 Ла8 36.g5 Кd5+ 37.К:d5 Ла3+ 38.Лd3 Л:d3+ 39.Кр:d3 Кр:d5 40.Кре3 Кре5 41.Крf3 d5 42.cd cd 43.Кре3 Крf5, 0:1.

Уладзіслаў Кавалёў – Махамад Мурадлі (Азербайджан)

1.е4 d6 2.d4 Кf6 3.Кс3 g6 4.Кf3 Сg7 5.Се3 0-0 6.Фd2 а6 7.Сh6 b5 8.Сd3 Сb7 9.С:g7 Кр:g7 10.е5 de 11.de Кfd7 12.Фе3 С:f3 13.gf f6 14.0-0-0 К:е5 15.С:g6 hg 16.Л:d8 Л:d8 17.f4 Кf7 18.Лg1 Лh8 19.Кd5 Кс6 20.К:с7 Лас8 21.Ке6+ Крh7 22.Фg3 Лhg8 23.Фh4+ Кh6 24.Лg3, 1:0.

Наш чэмпіён свету

Ягор Сіліч з Віцебска выйграў у турэцкай Анталіі чэмпіянат свету сярод школьнікаў ва ўзроставай катэгорыі да 13 гадоў.

Берлін і Браціслава

Міжнародны майстар з Клічава Аляксандр Булаўка заваяваў бронзавы медаль на адкрытым чэмпіянаце Германіі па рашэнні кампазіцый. З 29 удзельнікаў, якія прадстаўлялі 10 краін, яго апярэдзілі толькі гросмайстры Барыс Тумес (Германія) і Эдзі ван Бірс (Бельгія). А крыху раней А.Булаўка перамог у чэмпіянаце Славакіі (14 рашальнікаў з 6 краін). Мінчанін Мікалай Сігневіч фінішаваў там пяты.

Праверце адказы

Задача М.Быкава, змешчаная ў «Народнай Волі» 16 красавіка, рашаецца: **1.f7.** Першымі правільна адказалі ***Мікалай Шклярэўскі, Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч.*** А вось ход 1.Лс6?, які прапанаваў Леанід Калодка, не вядзе да мэты з-за адказу 1...Кс8!

На шэраг папярэдніх задач правільна адказалі ***Ігар Гулік, Уладзімір Панько, Леанід Калодка.***

Вадзім ЖЫЛКО.

Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.

Рэкламны аддзел (017) 328-66-09.
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info

Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Заснавальнік і галоўны рэдактар
Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

Паколькі ў рэдакцыі няма магчымасці рэцэнзаваць і вяртаць нявыкарыстаныя матэрыялы, яна пакідае права ўступаць у перапіску за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 10.06.2019 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 23 005 экз. Заказ № 2005.

